КРАЕВЕДЧЕСКИЙ
КЕЙС
СОЛИГОРСКА

# Савецкае будаўніцтва

## Дамавыя камітэты

Пры Салігорскім пасялковым Савеце створаны і працуюць вулічныя і дамавыя камітэты. Дзейнасцю гэтых камітэтаў паўсядзённа кіруе выканком Савета.

Асабліва добра працуе камітэт дома № 10 па вуліцы імя Заслонава. Старшыня яго тав. Дзянісава праводзіць паўсядзённую выхаваўчую работу з жыхарамі, сочыць за захаванасцю жылога фонду. Па ініцыятыве камітэта праведзена значная работа па добраўпарадкаванню двара, былі разбіты клумбы, пасаджаны кветкі і г. д.

Пачалі таксама сваю работу камітэты дамоў № 4 па вуліцы імя Заслонава (старшыня тав. Струбчэня А. Ф.), № 23 па вуліцы імя Горкага (старшыня тав. Лосік І. Я.) і некаторыя іншыя. Цяпер, у асенні перыяд, дамавыя камітэты павінны арганізаваць пасадку дэкаратыўных дрэўцаў, падсеяць травы ў скверах і правесці іншыя работы па добраўпарадкаванню горада.

Т. НЕКРАШЭВІЧ,
сакратар выканкома Салігорскага пасялковага Савета.